# *З ВОПЫТУ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ДЛЯ СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА І РЭАЛІЗАЦЫІ МАСТАЦКІХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАГРАМ НА ПРЫКЛАДЗЕ БЕЛАРУСКІХ І ЗАМЕЖНЫХ ТВОРЧЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ*

(у кантэксце мадэрнізацыі асноўных прынцыпаў сістэмы мастацкай адукацыі)

*(Па матэрыялах перыядычнага друку за 2003 – першую палову 2005 г.)*

Сёння перад мастацкай адукацыяй паўстала неабход-насць аператыўнага вырашэння шэрага старых і новых праблем, што выклікана асаблівасцю і спецыфікай мастац-кіх адукацыйных устаноў. Мастацкая сістэма адукацыі прадстаўляе сабой цэласную інтэгравануюрознаўзроўневую мадэль падрыхтоўкі кадраў. Прафесійная падрыхтоўка мас-тацкіх кадраў у спецыяльных навучальных установах мае сваю спецыфіку, што выклікана складанай прыродай са-мога паняцця мастацкай адукацыі, якая ўключае эстэтыч-нае выхаванне, агульную мастацкую адукацыю і прафесій-нае мастацкае навучанне. Рэалізацыя адукацыйных пра-грам ажыццяўляецца ва ўсіх тыпах устаноў – ад дзіцячага садка да вышэйшых устаноў.

Сістэма прафесійнай адукацыі цесна ўзаемазвязана як з сістэмай мастацкага выхавання, так і з сістэмай мастац-кай творчасці. Гэтыя ж сістэмы базіруюцца на спалучэнні ведаў з асабістымі (часта прыроджанымі) якасцямі чала-века.

Сэнс *мастацкага выхавання* – у стварэнні ўмоў, якія стымулююць развіццё індывідуальнасці асобы сродкамі мастацтва, у набыцці мастацкай кампетэнцыі і глядацкай эрудыцыі, ва ўменні самастойнага выкарыстання выразнай мовы розных відаў мастацтва. Атрыманыя ў данай сістэме эстэтычныя веды не абавязкова будуць потым накіраваны на прафесійную дзейнасць.

Сістэма *прафесійнай мастацкай адукацыі* ў многім супадае з сістэмай выхавання: для іх прыярытэтнымі з’яў-ляюцца ўзроставая дыферэнцыяцыя і дыферэнцыяцыя з улікам нацыянальных традыцый. Аднак мэты мастацкага выхавання і мастацкай адукацыі розныя. Мастацкая аду-кацыя, атрыманая ў спецыяльных навучальных установах, – гэта спосаб развіцця творчай індывідуальнасці, фарміра-вання гарманічнай асобы ў працэсе прафесійнага засваення мастацкай культуры. Установы мастацкай адукацыі рых-туюць спецыялістаў, у кваліфікацыйную характарыстыку якіх уваходзяць

абавязковае валоданне сістэматызаванымі тэарэтычнымі ведамі ў сферы культуры і мастацтва, выка-нальніцкімі ўменнямі і навыкамі на высокім прафесійным узроўні. У гэтым кантэксце асаблівая спецыфіка навучаль-най установы дэтэрмінуецца непарыўнасцю мастацкай аду-кацыі і мастацкай творчасці. Такая двухадзіная мастацка-творчая лінія, адлюстроўваючы светаўспрыманне творчай асобы, не можа не ўплываць на характар навучальнай уста-новы. Яна вызначае адносную самастойнасць, разнастай-насць і самабытнасць форм мастацкай адукацыі.

Нельга не звяртаць увагу на той факт, што новыя падыходы да філасофскай, мастацтвазнаўчай, педагагічнай навукі спрыяюць фарміраванню асабіста-творчай мастац-кай ідэалогіі, у якой мастаку адводзіцца роля насіцеля мас-тацкіх сэнсаў. Таму прыярытэтным напрамкам дзейнасці адукацыйнай творчай установы становіцца не толькі наву-чанне ведам і навыкам прафесійнага мастацкага майстэр-ства, але і як абавязковая частка – развіццё творчай інды-відуальнасці, фантазіі, арыгінальных, самабытных твор-чых вырашэнняў. У такіх умовах змест навучання, яго ме-тады накіраваны на забеспячэнне студэнту максімуму твор-чай свабоды пры непазбежным абмежаванні сферы нарма-тыўнай рэгламентацыі [10].

З 1 верасня 2003 г. ВНУ культуры і мастацтва Расіі пры-ступілі да падрыхтоўкі кадраў па шэрагу новых спецыяль-насцей у рамках напрамку “культура і мастацтва”. Асноў-нымі прадпасылкамі абнаўлення з’явіліся: прынцыповыя змяненні сацыяльна-эканамічных асноў грамадства; актыў-нае развіццё новых інфармацыйных тэхналогій, глабальная інфарматызацыя і станаўленне інфармацыйнага грамад-ства; змяненне фактараў, якія вызначаюць развіццё сістэ-мы вышэйшай адукацыі і г.д.

Новыя стандарты, зацверджаныя Міністэрствам адука-цыі РФ, канстатуюць, што:

– напрамак культуры і мастацтва афіцыйна прызнаны шматпрофільным і рыхтуе розных па навыках і сферы дзейнасці спецыялістаў;

– зацверджана шматступеньчатая структура падрых-тоўкі студэнта: бакалаўр (вучыцца 3–4 гады), арыентаваны на агульную прафесійную адукацыю і рамесленыя навыкі; дыпламаваны спецыяліст (яшчэ 1–2 гады), здольны пра-явіць сябе як майстар у выбранай ім сферы; магістр, гато-вы да навукова-педагагічнай распрацоўкі праблем культу-ры і мастацтва (на гэта адводзіцца дадатковы шосты год навучання) [17].

Прафесійнае навучанне па шэрагу творчых спецыяль-насцей і спецыялізацый магчыма пры наяўнасці пэўных псіхафізічных якасцей

чалавека (генетычнай схільнасці, тэмпераменту, слыху, зроку і г.д.). Прыродныя даныя ігра-юць вялікую ролю, яны абавязкова ўлічваюцца пры адбо-ры абітурыентаў і рабоце са студэнтамі. Менавіта таму на-бор у творчыя навучальныя ўстановы вельмі складаны і звязаны з пошукам адораных асоб у кожнай сферы мас-тацкай культуры.

Адным з напрамкаў рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі ў кантэксце Канцэпцыі мадэрнізацыі расійскай адукацыі з'яўляецца *дыверсіфікацыя* (разнастайнасць фор-маў), з якой вучоныя звязваюць фарміраванне новай аду-кацыйнай парадыгмы. Дыверсіфікацыя адукацыі – адна са складаных сацыяльна-педагагічных з'яў, якія характары-зуюць сучасны перыяд развіцця сусветнай адукацыйнай сістэмы. Яна прадугледжвае пошук выхаду з крызісу аду-кацыі, фарміраванне новай адукацыйнай парадыгмы, якая арыентуецца на асобу, павышэнне ступені гібкасці адука-цыйнай сістэмы, яе здольнасці да хуткай перабудовы, улі-ку ўзросшых запатрабаванняў грамадства да вынікаў дзей-насці адукацыйных сістэм. Крызіс адукацыі ў Расіі адлюст-роўвае частку агульнасусветнага крызіснага стану адука-цыйнага працэсу, і яго пераадоленне залежыць менавіта ад дыверсіфікацыі адукацыі. Упершыню тэрмін "дыверсіфіка-цыя" быў выкарыстаны ў сярэдзіне 1950-х гадоў у прымя-ненні да эканомікі развітых капіталістычных краін у сувя-зі з працэсам канцэнтрацыі капітала на міжгаліновым узроўні. У педагагічнай навуковай лексіцы ён стаў ужы-вацца з канца 1960-х гадоў, калі ў Заходняй Еўропе паў-стала пытанне аб структурным рэфармаванні адукацыйных сістэм, маючы на ўвазе пашырэнне пераліку прапануемых адукацыйных паслуг, засваенне навучэнцамі новых, раней не існуючых відаў дзейнасці [10].

У Расіі працэс пераходу да рыначных адносін не мог не закрануць сферы адукацыі. Новыя эканамічныя, сацыяль-ныя і дэмаграфічныя ўмовы патрабавалі збалансаванага па-дыходу да рынку адукацыйных і навуковых паслуг. Вучэб-ныя ўстановы былі пастаўлены перад неабходнасцю ства-рэння навуковай канцэпцыі развіцця, выяўлення стратэгіі і тактыкі сваёй дзейнасці.

Агульнымі *характэрнымі рысамі дыверсіфікацыі* аду-кацыі з'яўляюцца якаснасць, асабістая накіраванасць, сва-бода выбару, адпаведнасць запатрабаванням рынку. *Струк-турныя прынцыпы дыверсіфікацыі*: многаўзроўнасць, сту-пеньчатасць, варыятыўнасць, гібкасць і многафункцыя-нальнасць.

*Многаўзроўнасць* сістэмы забяспечвае развіццё беспера-пыннай прафесійнай адукацыі, стварае ўмовы для рэаліза-цыі разнастайных адукацыйных праграм з улікам узросту, асаблівасцей чалавека, узроўню

яго адукацыі, запатраба-ванню на рынку працы.
*Ступеньчатая* падрыхтоўка кадраў прадугледжвае ава-лодванне прафесійнымі ведамі ў выглядзе завершаных бло-каў інфармацыі, што дазваляе асобе самастойна пабудаваць сваю адукацыйную мадэль.
*Варыятыўнасць і гібкасць* забяспечваюць шырокі вы-бар ведаў, прафесій, спецыяльнасцей, спецыялізацый і магчымасць самакантроля студэнта над часам і скорасцю асваення ведаў.
*Шматфункцыянальнасць* сістэмы дазваляе развіваць рэгіянальную сетку вучэбных установ, фарміраваць адзі-ную культурна-адукацыйную прастору, дае насельніцтву роўныя магчымасці ў атрыманні прафесійнай адукацыі, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі.
Такім чынам, у *канцэптуальныя асновы сучаснай аду-кацыйнай парадыгмы* закладзены агульныя прынцыпы аб-наўлення, дыверсіфікацыя адукацыі, рэструктурызацыя вучэбных установ, бесперапыннасць адукацыі, арыентава-насць на рыначныя адносіны, стварэнне ўмоў канкурэнта-здольнасці спецыялістаў, абнаўленне якасці адукацыі [10].
Калі разгледжваць *сістэму мастацкай адукацыі* ў кан-тэксце асноўных прынцыпаў мадэрнізацыі і дыверсіфіка-цыі, можна канстатаваць, што прынцып пераемнасці ў пад-рыхтоўцы кадраў з'яўляецца галоўным у выхаванні буду-чага спецыяліста ў галіне мастацтва. Сістэма мастацкай адукацыі ў Расіі складваецца на аснове трыяды *школа – вучылішча – вышэйшая навучальная ўстанова* і з'яўляец-ца мадэллю многаступеньчатай адукацыйнай сістэмы. Пад-рыхтоўка харэографаў, музыкантаў, мастакоў пабудавана на пераемнасці абучэння і заключаецца ў тым, што без засваення адной ступені (узроўню) адукацыі студэнт не можа паступаць і вучыцца на наступнай ступені. Кожная ступень прадугледжвае блок ведаў, уменняў, навыкаў, якія развіваюцца, ускладняюцца па меры засваення праграм наступнага адукацыйнага ўзроўню. Ідэі дыверсіфікацыі адукацыі ў пэўнай ступені ўжо сталі традыцыйнымі прын-цыпамі ў сістэме мастацкай адукацыі многіх краін. Вучэбныя ўстановы мастацтва Расіі па сутнасці ўжо выконваюць задачу многафункцыянальных сістэм і прад-стаўляюць сабой адзіны прафесійны навукова-метадычны і вучэбны комплекс, аб'яднаны ідэяй рэалізацыі адукацый-ных праграм розных узроўней.
Адметнай прыкметай мастацка-адукацыйнай установы з'яўляецца разнастайнасць і арыгінальнасць форм аргані-зацыі вучэбнага працэсу, наяўнасць унутры вучэбнай уста-новы школ, студый, класаў, мастацкіх майстэрань, лабара-торый, што рэалізуюць прынцыпы варыятыўнасці і гібкас-ці. Гэта – творчыя калектывы студэнтаў пад кіраўніцтвам майстра

пэўнай мастацкай вобласці, што спалучаюць у сва-ёй працы вучэбныя, эксперыментальныя і вытворчыя зада-чы.
Важным педагагічным метадам у мастацкіх вучэбных установах з’яўляецца своеасаблівы працэс спалучэння тэа-рэтычных і практычных заняткаў, паралельнае замацаван-не атрыманых ведаў на прыкладзе стварэння канкрэтнага мастацкага твора. Абучэнне прадугледжвае методыку пра-вядзення заняткаў, заснаваную на шырокім спектры праб-лемных, эўрыстычных, ігравых, крэатыўных і іншых мета-дах. Такія прадуктыўныя формы стымулююць творчыя здольнасці студэнтаў праз непасрэднае далучэнне да мас-тацка-творчай дзейнасці, успрыманне, інтэрпрэтацыю, ана-ліз структуры мастацкага твора праз усваенне мастацкіх ведаў. Увесь цыкл заняткаў павінен спрыяць фарміраван-ню эстэтычнага адчування, індывідуальнага, творчага мыс-лення асобы [10].

Для вырашэння задач, якія стаяць перад ВНУ культу-ры і мастацтва, неабходна аб’яднанне намаганняў усіх ВНУ на аснове карпаратыўнай дзейнасці. Эфектыўнасць сумеснай дзейнасці ў значнай меры залежыць ад яе стратэ-гіі і тактыкі.
Да *стратэгічных* задач карпаратыўнай дзейнасці ВНУ культуры і мастацтва па фарміраванні вучэбна-метадычна-га забеспячэння новага пакалення адукацыйных стандар-таў па спецыяльнасці “культура і мастацтва”, якія трэба разумець як мастацтва агульнага кіраўніцтва, якое базіру-ецца на аналізе і ацэнке суадносін асноўных сіл на даным этапе развіцця, трэба аднесці:
– працяг і пашырэнне плённага вопыту калектыўнай працы па стварэнні часовых творчых калектываў з ліку вядучых выкладчыкаў ВНУ краіны для падрыхтоўкі роз-ных відаў вучэбных выданняў;
– распрацоўку поўнага пераліку вучэбных выданняў, ад элементарных да самых складаных, уключая традыцый-ныя і электронныя, з выяўленнем іх кампанентнай струк-туры і тыпалагічных асаблівасцей;
– распрацоўку тэхналогіі і методык стварэння вучэб-ных выданняў, у тым ліку электронных, распрацоўку кры-тэрыяў і паказальнікаў іх комплекснай ацэнкі;
– стварэнне галіновай сістэмы стандартызацыі вучэб-ных выданняў;
– стварэнне базы даных калектыўнага карыстання, у якой змяшчаецца інфармацыя аб распрацаваных ВНУ ву-чэбных выданняў;
– фінансавае, матэрыяльна-тэхнічнае, арганізацыйнае і інфармацыйнае забеспячэнне карпаратыўнай дзейнасці ВНУ па фарміраванні вучэбна-метадычнага забеспячэння новага пакалення адукацыйных стандартаў

[17].
Важнае значэнне ў вырашэнні гэтага напрамку дзей-насці мае рэалізацыя *тактычных* задач. У адрозненні ад стратэгічных, арыентаваных на карпаратыўнае ўзаемадзе-янне, тактычныя задачы скіраваны на ўнутраную дзей-насць. Сярод іх:
– арыентацыя ў дзейнасці па фарміраванні вучэбна-метадычнага забеспячэння новага пакалення на прынятыя ВНУ стратэгічныя вырашэнні, дзяржаўныя адукацыйныя стандарты і галіновыя стандарты на вучэбныя выданні;
– забеспячэнне дакладнага планавання стварэння ву-чэбна-метадычнай літаратуры па розным вучэбным дыс-цыплінам, кафедрам, факультэтам, ВНУ у цэлым на аснове перспектыўнага плана і фарміравання вучэбна-метадычнага забеспячэння новага пакалення адукацыйных стандартаў па спецыяльнасці “культура і мастацтва”;
– арганізацыя знешняй і ўнутранай экспертызы пад-рыхтаваных вучэбных выданняў.
Аднак, як адзначаюць рэктар Кемераўскага дзяржаў-нага універсітэта культуры і мастацтваў, прафесар
А.Л. Кудрына і прарэктар па вучэбнай рабоце Акадэміі пра-ва і кіравання (г. Масква) Я.В. Уцін, сёння ў Расіі існуюць два палярных пункты погляду на ролю і значэнне адука-цыйных дзяржаўных стандартаў. Адзін з іх фарміруецца на базе традыцыйных прадстаўленняў аб прыярытэтнасці зберажэння і развіцця адзінай нацыянальна-дзяржаўнай адукацыйнай прасторы, другі – на аснове прадстаўленій аб развіваючым навучанні, арыентаваным на індывідуальнае развіццё асобы, якое не можа вызначацца нейкімі агуль-нымі, зацверджанымі на дзяржаўным узроўні адукацый-нымі стандартамі [17].
Асобную спецыфіку ў сферы прафесійнай мастацкай аду-кацыі мае *педагагічны патэнцыял*. Працоўная дзейнасць выкладчыкаў гэтай сферы накіравана на падрыхтоўку вы-сокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін куль-туры, мастацтва і адукацыі: музыкантаў-выканаўцаў і вы-кладчыкаў ігры на розных музычных інструментах, спева-коў, кампазітараў, дырыжораў, музыказнаўцаў; акцёраў драматычных, музычных, лялечных тэатраў, кіно; рэжысё-раў драматычных і музычных тэатраў, ігравога і дакумен-тальнага кіно, тэатралізаваных прадстаўленняў і свят; спе-цыялістаў у галіне манументальна-дэкаратыўнага, дэкара-тыўна-прыкладнога мастацтва, народных промыслаў, ды-зайну і г.д. Дзякуючы такой разнастайнасці напрамкаў падрыхтоўкі студэнтаў прафесія педагога ў галіне прафе-сійнай

мастацкай адукацыі ўнутрана раздроблена ў адпа-веднасці з напрамка падрыхтоўкі спецыялістаў у прафесій-най вучэбнай установе, кожны з якіх вылучае сваю сукуп-насць патрабаванняў да асабістых якасцей педагога, яго прафесійнай кваліфікацыі і прафесійнага статусу. Аднак пры ўсёй разнастайнасці задач у сферы прафесійнай мас-тацкай адукацыі, вырашэнне іх немагчыма без высокага ўзроўню прафесіяналізму прафесарска-выкладчыцкага скла-ду. У вышэйшай школе вялікае значэнне мае навуковы ста-тус педагога: наяўнасць вучоных ступеней і званняў, аб'ём навуковых і метадычных публікацый, удзел у навуковых форумах (канферэнцыях, сімпозіумах, навуковых чытан-нях). Менавіта гэтыя параметры ў значнай ступені харак-тарызуюць ВНУ як навуковы і адукацыйны цэнтр, выяў-ляюць яго статус і месца ў рэйтынгу ВНУ краіны. Аднак у вышэйшых навучальных установах мастацтва ёсць і асобая кадравая спецыфіка педагагічнага саставу, якая заключа-ецца ў шырокім прыцягненні народных і заслужаных ар-тыстаў, мастакоў, дзеячоў творчых саюзаў, лаўрэатаў кон-курсаў, удзельнікаў выставак і г.д.
Гэта вылучае яшчэ адну асаблівасць работы з кадрамі ў галіне прафесійнай мастацкай адукацыі – павышэнне твор-чай кваліфікацыі выкладчыкаў шляхам стварэння ўмоў для іх удзелу ў прафесійных конкурсах, ажыццяўлення кан-цэртнай і тэатральнай дзейнасці, што спрыяе ўдасканален-ню іх выканальніцкага майстэрства. Значную ролю адыгры-вае і той факт, што вядомыя майстры ў працэсе педагагіч-най практыцы маюць магчымасць прыцягваць сваіх сту-дэнтаў да працы ў тэатрах, аркестрах, харэаграфічных ка-лектывах, да ўдзелу ў канцэртнай дзейнасці, што мае вялі-кае значэнне для выхавання будучых творцаў. Асобае месца ў вучэбным працэсе займаюць у апошнія гады "майстар-класы", якія праводзяць вядомыя дзеячы мастацтва. Такая творчая форма выконвае двухадзіную за-дачу – перадае выканальніцкі вопыт студэнтам і знаёміць педагагічны састаў вучэбнай установы з аўтарскай методы-кай выкладання.
Да спецыфічных асаблівасцей выкладчыцкіх кадраў у сферы прафесійнай мастацкай адукацыі адносіцца і тое, што педагог павінен мець высокі асабісты інавацыйна-твор-чы патэнцыял, валодаць "пачуццём новага", здольнасцю спалучаць засваенне ведаў з сумежных галін са сваёй прад-метнай вобласцю, рэальным вопытам, уменнем знаходзіць новае ў старым, ужо засвоеным вопыце, спалучаць трады-цыі (у тым ліку рэгіянальныя, мясцовыя, лакальныя) з не-стандартным падыходам да справы, з новымі трактоўкамі мастацкіх твораў. Сярод асабістых якасцей педагогаў сфе-ры прафесійнай мастацкай адукацыі

трэба вылучыць та-кія, як эмацыянальнасць і сумежныя з ёй (камунікабель-насць, узбуджальвасць і рухавасць нервовай сістэмы, здоль-насць да суперажывання, сіла пачуццяў) [10].
Пры прафесійнай падрыхтоўцы важна фарміраваць у будучага спецыяліста культуры і мастацтва духоўную асно-ву, уносіць у адукацыйны працэс рэфлексіўныя механізмы разумення асноўных паняццяў, выпрацаваных з дапамогай культурнага і эстэтычнага выхавання – ідэалы, каштоўнас-ці, маральнасць.
Сёння расійскае грамадства перажывае складаны пеpы-яд свайго развіцця і знаходзіцца як бы на духоўным разда-рожжы. Ігнаруецца многае з таго, што стала здабыткам культурнага вопыту народа. Таму для выкладчыка вышэй-шай школы аб’ектыўнай неабходнасцю становіцца напаў-ненне адукацыйна-выхаваўчага працэсу адносінамі, якія студэнты перажываюць у рэальным існаванні, каб адбыло-ся далучэнне будучага спецыяліста да ўзроўню сучаснай культуры, каб ён навучыўся жыць “тут і цяпер”, у кан-тэксце данай культуры, каб мог творча развіваць яе ў да-лейшым, ужо ў працэсе сваёй прафесійнай дзейнасці [11].

Неабходна не толькі абазначыць вострыя праблемы рэ-фармавання мастацкай адукацыі, але і знайсці шляхі іх вырашэння. Відавочна, што сістэма ўстаноў мастацкай пра-фесійнай адукацыі, якая прадстаўляе сабой складаны са-цыякультурны фенамен, не павінна быць разбурана. Збера-жэнне і развіццё гэтай сістэмы павінна быць звышзадачай мадэрнізацыі мастацкай адукацыі. Пры падрыхтоўцы нар-матыўна-прававой базы адукацыйных рэформ неабходна ўлічваць спецыфіку падрыхтоўкі кадраў у галіне мастацтва.
Як лічыць кандыдат мастацтвазнаўства В.Ф. Зіва, праб-лемы мастацкай адукацыі ў Расіі часта ігнаруюцца. На-прыклад, з уводам адзінага дзяржаўнага экзамена (АДЭ) у сістэму расійскай адукацыі ўскладняецца становішча ся-рэдніх прафесійных устаноў і ВНУ культуры і мастацта. Прыём на шэраг спецыяльнасцей па выніках АДЭ немаг-чымы, бо галоўным тут з’яўляецца экзамен па выбранай мастацка-творчай спецыяльнасці, да якога сярэдняя шко-ла не рыхтуе. Гэту місію выконваюць вучылішчы і кале-джы культуры і мастацтва, якія не толькі выяўляюць творчыя здольнасці, але і забяспечваюць пэўны ўзровень ведаў у сферы мастацка-творчых спецыяльнасцей, неабход-ны як для прафесійнай дзейнасці, так і для паступлення ў ВНУ. У той жа час ёсць верагоднасць, што няўдзел вучэб-ных устаноў культуры ў эксперыменце з АДЭ адаб’ецца на фінансавых паступленнях па дзяржаўных імянных фінан-савых абавязацельствах.

Не менш важным з’яўляецца пытанне атрымання дру-гой вышэйшай адукацыі, якае, як вядома, з’яўляецца плат-най. Але ж у сферы мастацтва першая вышэйшая адука-цыя ў некаторых выпадках – толькі неабходная база для атрымання другой. Такое пытанне вельмі востра стаіць у падрыхтоўцы рэжысёраў драматычнага і музычнага тэатра, кіно і тэлебачання, сцэнарыстаў, літаратурных работнікаў, якім патрабуецца не толькі талент, але і жыццёвы вопыт, сталасць мастацкага мыслення, уменне быць кіраўніком творчага калектыву. Улічваючы гэтыя абставіны, для нека-торых прафесій неабходна зрабіць выключэнне, што дазво-ліць вырашыць у мастацкай адукацыі пытанні якасці на-вучання і канкурэнтаздольнасці спецыялістаў на рынку працы, што таксама адпавядае ідэям мадэрнізацыі адука-цыі [10].

У сучаснай Еўропе хуткімі тэмпамі адбываецца інтэгра-цыя ў эканамічнай, фінансавай, палітычнай, адукацыйнай дзейнасці. У маі 1998 г. было падпісана *Сарбонскае пагад-ненне* ў гонар 800-годдзя Парыжскага Універсітэта. У ім ішла размова аб развіцці еўрапейскага супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі.
19 чэрвеня 1999 г. 29 еўрапейскіх краін падпісалі ў г. Балоны (Італія) пагадненне, якое атрымала назву *“Балонскі працэс”*. У гэтым дакуменце прапанавалася на працягу 10 гадоў распрацаваць меры для інтэграцыі еўра-пейскіх краін у адзіную адукацыйную прастору.
Для рэалізацыі гэтай мэты прапануецца:
1. Перайсці на шматузроўневую сістэму адукацыйнай падрыхтоўкі – бакалаўр (3–4 гады навучання) і магістр (5–6 гадоў навучання, дыпламаваны спецыяліст).
2. Распрацаваць дакладныя крытэрыі ацэнкі якасці вы-шэйшай адукацыі, адпаведнасці адзіным адукацыйным стандартам, увядзення адзіных дадаткаў да дыпломаў, якія б сведчылі аб колькасці і аб’ёмах вывучаных дысцыплін.
3. Выпрацаваць сістэму мер для прызнання (настрыфі-кацыі) дыпломаў, параўнання ўзроўню кваліфікацыі з мэ-тай прадстаўлення работы ў адпаведнасці з атрыманай адукацыяй.
4. Увесці сістэму заліковых адзінак – крэдытаў, у якіх падлічваецца аб’ём ведаў і працаёмкасць вучэбнай работы. Для атрымання вышэйшай адукацыі неабходна набраць пэўную суму крэдытаў. Прадметы для вывучэння можна абраць самастойна, аднак іх “крэдытны кошт” павінен ад-павядаць неабходнай для дыплома суме. Такая сістэма практыкуецца ў многіх заходніх універсітэтах. Гэты меха-нізм выкарыстоўваецца для пацвярджэння дыплома аб вы-шэйшай адукацыі ў іншых краінах, для

перазаліка пра-слуханых курсаў.
5. Устараніць перашкоды на шляху эфектыўнай ма-більнасці студэнтаў і спецыялістаў, забяспечыць удзел студэнтаў і выкладчыкаў у агульнаеўрапейскіх даследаван-нях, у кааперацыі вышэйшых навучальных установаў.
Усё гэта павінна садзейнічаць узмацненню інтэлекту-альнага, сацыяльнага, культурнага, навуковага і тэхнічна-га патэнцыялу краін Еўропы, міжнароднаму супрацоўніцт-ву і культурнаму абмену.
Балонская дэкларацыя надае асо-бае значэнне выпрацоўцы агульных крытэрыяў акрэдыта-цыі ВНУ, пытанням гарантыі якасці адукацыі, канверген-цыі нацыянальных адукацыйных праграм. З гэтай мэтай 19 мая 2001 г. у г. Празе адбылася сустрэча міністраў вы-шэйшай адукацыі краін, якія падпісалі Балонскую дэкла-рацыю. Яны пацвердзілі абавязацельства аб стварэнні *"Зоны еўрапейскай вышэйшай адукацыі"* да 2010 г., пазі-тыўна ацанілі актыўнае далучэнне да Балонскага працэсу Еўрапейскай асацыяцыі універсітэтаў і асацыяцый нацыя-нальных саюзаў студэнтаў у Еўропе.
Восенню 2002 г. у г. Санкт-Пецярбургу адбыўся міжрэ-гіянальны семінар *"Развіццё еўрапейскай сістэмы адука-цыі на аснове Балонскай дэкларацыі 1999 г."*, на якім аб-мяркоўваліся праблемы далучэння ВНУ Расіі ў еўрапей-скую інтэграцыю ў сферы вышэйшай адукацыі.
У гэтай сувязі вельмі важным з'яўляецца стратэгія адаптацыі Балонскага працэсу ў расійскай традыцыйнай сістэме адукацыі ў цэлым і мастацкага навучання ў пры-ватнасці. У гэтым напрамку неабходна ажыццявіць шэраг арганізацыйных крокаў: стварыць рабочую міжведамасную групу, якая будзе займацца пытаннямі распрацоўкі ўзгод-неных прапаноў, падрыхтоўкай дакументаў для абмерка-вання іх навукова-педагагічнай грамадскасцю, кіраўнікамі ўстаноў вышэйшай і сярэдняй прафесійнай адукацыі; пра-весці нараду, на якой абмеркаваць дакументы з удзелам зацікаўленых ведамстваў, структур заканадаўчай і выка-наўчай улады, майстроў мастацтваў і дзеячаў культуры; запланаваць фінансаванне групы распрацоўшчыкаў і неаб-ходных мерапрыемстваў [10].

* * *

Роля мастацтва і культуры ў нацыянальнай сістэме адукацыі і выхавання з'яўляецца надзвычай важнай, бо выхаванне сучаснага грамадзяніна Беларусі, ад якога ў бліжэйшым будучым будзе залежаць аўтарытэт нашай краіны ў свеце, немагчыма без мастацка-эстэтычнай адука-цыі, без фарміравання ў яго высокіх маральных і духоў-ных якасцей.
Дзяржаўная адукацыя ў сферы культуры і мастацтва мае ўстойлівую

сістэму, якая захоўвае прынцып пераем-насці і бесперапыннасці навучання. Пачатковае, сярэдняе спецыяльнае і вышэйшае звёны, як часткі гэтай сістэмы, паспяхова функцыянуюць, трывала ўзаемазвязаны, забяс-печваюць роўны доступ ў атрыманні мастацкай адукацыі [5].
Галоўную ролю ў сістэме мастацкай адукацыі Беларусі адыгрываюць 3 вышэйшыя навучальныя ўстановы – *Бела-руская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларускі дзяржаўны універ-сітэт культуры і мастацтваў*. Яны набылі статус буй-ных культурных і навуковых цэнтраў, дзе сканцэнтраваны значны педагагічны і навукова-творчы патэнцыял. Асноў-ны штатны прафесарска-выкладчыцкі персанал ВНУ куль-туры і мастацтваў складае 633 чалавекі. На ўмовах сумя-шчальніцтва працуюць 159 чалавек. У ліку асноўнага пер-саналу – 20 дактароў навук, 152 кандыдаты навук, 62 пра-фесары, 188 дацэнтаў (даныя 2002 г.) [15].
На ўзроўні сучасных патрабаванняў рыхтуюцца высо-какваліфікаваныя спецыялісты для ўсіх рэгіёнаў рэспублі-кі. Штогод выпускаецца больш за 2 тыс. спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй па 69 спецыялізацыях. Па даных 2002 г., у ВНУ культуры і мастацтва навучаецца больш за 5,8 тыс. студэнтаў, з якіх 4,4 тыс. – за кошт бюджэтных сродкаў. Падрыхтоўка, у тым ліку мэтавая, вядзецца па 35 спецыяльнасцях.
У 2002 г. ВНУ культуры і мастацтваў выпушчана 550 маладых спецыялістаў. Выпускнікі накіроўваюцца не толь-кі ў сферу прафесійнага мастацтва і ўстановы культуры, частка іх паспяхова працуе ў сістэме адукацыі. З цягам ча-су ўдасканальваецца дзейнасць навучальных устаноў, па-шыраюцца іх магчымасці. Многія якасныя змены адбыва-юцца дзякуючы сумесным намаганням міністэрстваў куль-туры і адукацыі. Нашы вышэйшыя навучальныя ўстановы набылі статус акадэмій і універсітэта, сталі вядучымі вы-шэйшымі навучальнымі ўстановамі. Створаны саветы па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый [5, 15].
Беларуская сістэма мастацкай адукацыі адметна тым, што прадстаўляе магчымасць кожнаму жадаючаму творча рэалізавацца, атрымаць адукацыю на яго інтэлектуальным узроўні. Нездарма ва ўсіх гарадах і пасёлках краіны зараз ёсць мастацкія і музычныя школы, спецыяльныя гімназіі, школы з эстэтычным уклонам. У апошнія гады з’явіліся новыя тыпы навучальных устаноў – каледжы. На сённяш-ні дзень у Беларусі дзейнічаюць 21 ССНУ. Дзяржава гаран-туе даступнасць атрымання вышэйшай мастацкай адука-цыі ў кожным рэгіёне краіны: за апошнія гады ў кожным абласным цэнтры створаны філіялы Беларускай

дзяржаў-най акадэміі музыкі. Спецыялізаваным ВНУ для паляп-шэння арганізацыі навучальнага працэсу выдзелены новыя памяшканні, па-сучаснаму абсталяваныя вучэбныя аўдыто-рыі. Прынята рашэнне па стварэнні маладзёжнага опернага тэатра пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і вы-дзелены сродкі для закупкі адпаведных інструментаў і камп’ютарнага абсталявання [9, 16].
Праз мэтавыя наборы, дадатковыя ільготы ажыццяўля-ецца падтрымка дзяцей сельскіх школ, раёнаў, пацярпе-лых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, дзяцей-інвалідаў, якім складана вытрымаць жорсткую канкурэнцыю, трады-цыйна высокія конкурсы. (Дарэчы, каля 46% дзіцячых му-зычных школ і школ мастацтваў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці) [5].
У краіне паспяхова працуе сістэма атэстацыі навучаль-ных устаноў, якая забяспечваецца Дэпартаментам кантро-лю якасці адукацыі і Упраўленнем навучальных устаноў і кадраў.

Беларусь мае унікальную, пабудаваную на дзяржаўным узроўні сістэму работы з адоранымі дзецьмі і моладдзю. Амаль 10 гадоў таму створаны *Спецыяльны фонд Прэзідэн-та Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай мо-ладзі.* Такая ўстанова – унікальная з’ява для краін СНД. Звычайна фонды засноўваюць дабрачынныя арганізацыі ці асобныя мецэнаты, у Беларусі фонд дзейнічае пад патрана-жам кіраўніка дзяржавы. Асноўная задача фонду – ства-рыць умовы не толькі для выяўлення, станаўлення і раз-віцця таленавітай моладзі, але і для яе далейшай запатра-баванасці. Віды заахвочванняў фонду:
– Гранд-прэмія;
– прэмія;
– заахвочвальная прэмія;
– стыпендыя;
– грант;
– матэрыяльная дапамога.
За час існавання фонду фінансавая падтрымка была аказана 1517 асобам. З іх стыпендыятамі сталі 917 чала-век, заахвочвальныя прэміі атрымалі 126 выпускнікоў на-вучальных устаноў, 20 прэмій прысуджаны прадстаўнікам вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Матэрыяльную дапамогу атрымалі 434 чалавекі, двум былі прысвоены імянныя прэ-міі. Найвышэйшую ўзнагароду фонду – Гранд-прэмію – і званне лаўрэата Спецыяльнага фонду атрымалі 16 чалавек.
Фінансавая падтрымка фонду дазволіла рэалізаваць 45 творчых праектаў. Сярод іх – стварэнне творчай школы “Рэспубліканскі юнацкі

сімфанічны аркестр” з 80 юных музыкантаў пад кіраўніцтвам вядомага дырыжора А. Ані-сімава, арганізацыя міжнародных і рэспубліканскіх кон-курсаў, якія прайшлі ў Мінску, Брэсце, Гродна, Пінску, Светлагорску і іншых гарадах рэспублікі.

Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі супрацоўнічае з іншымі арганізацыямі, у тым ліку міжнароднымі, якія таксама дзейнічаюць у сферы культуры і мастацтва. Так, у 2005 г. упершыню была праведзена сумесная акцыя-канцэрт з Міжрэгіянальным расійскім дабрачынным фондам “Новыя імёны”. Традыцыйным стаў удзел беларускай дэлегацыі ў Дэльфійскіх гульнях. Фонд падтрымаў таксама такія пра-екты, як удзел ансамбля цымбалістаў Беларускай дзяржаў-най акадэміі музыкі ў VII Сусветным кангрэсе цымбалістаў у г. Апэнцэлі (Швейцарыя); “Міжнародны маладзёжны сім-фанічны аркестр” – школа маладых музыкантаў у г. Тры-ест (Італія), выдзяліў сродкі студэнтам тэатральнага і мас-тацкага факультэтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мас-тацтваў для ўдзелу ў V Міжнародным фестывалі лялечных тэатраў у г. Магдэбургу (Германія), вакальна-харэаграфіч-наму ансамблю “Валачобнікі” Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў для ўдзелу ў X Міжна-родным фестывалі народных традыцый у г. Віко-Экуенсе (Італія) [1, 7, 9, 20, 22].

Атрымлівалі гранты ВНУ Беларусі: Беларуская дзяр-жаўная акадэмія музыкі – на набыццё матэрыялаў і абста-лявання для мадэрнізацыі лабараторыі гуказапісу кабінета народнай музыкі; Беларуская дзяржаўная акадэмія мас-тацтваў – на забеспячэнне творчай дзейнасці студэнтаў мастацкага факультэта, тэатральнага, дэкаратыўна-прыклад-нога мастацтва, а таксама на атрыманне матэрыялаў і аб-сталявання для студэнтаў кафедры кінатэлемастацтва; Ма-гілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. Куляшова – на на-быццё музычных інструментаў і вучэбна-метадычнага збор-ніка “Усходнеславянская народная інструментальная му-зыка” для падтрымкі найбольш таленавітых студэнтаў у сувязі з 90-годдзем старэйшага універсітэта краіны.

У мэтах стварэння спрыяльных умоў для развіцця дзі-цячай і юнацкай творчасці, што з’яўляецца асновай далей-шай прафесійнай арыентацыі найбольш адораных навучэн-цаў, Магілёўскаму дзяржаўнаму музычнаму вучылішчу імя М. Рымскага-Корсакава, Магілёўскай гімназіі-каледжу музыкі і харэаграфіі і Светлагорскай дзіцячай школе мастацтваў Гомельскай вобласці вылучана 180 млн. руб. на набыццё канцэртных раяляў [1].

Стыпендыятам фонду можа стаць не кожны жадаючы, а толькі той, хто мае пэўныя творчыя дасягненні (перамогу ў міжнародным ці рэспубліканскім конкурсе і т.п.). Акра-мя таго, кандыдат павінен падпадаць пад адну з узроста-вых катэгорый стыпендыятаў. Стыпендыят перыядычна трымае творчыя справаздачы: праходзіць майстар-класы, удзельнічае ў канцэртах, выстаўках, фестывалях. Боль-шасць былых стыпендыятаў, за лёсам якіх уважліва со-чыць савет Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Бе-ларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, адбыліся як прафесіяналы і сёння ўжо альбо з'яўляюцца артыстамі вя-дучых творчых калектываў рэспублікі, альбо выкладаюць у спецыялізаваных ВНУ і перадаюць атрыманыя веды і вопыт маладзейшаму пакаленню.

Два гады таму ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры па даручэнні кіраўніка дзяржавы быў створаны банк даных стыпендыятаў фонду. Гэта база да-ных дазволіць не згубіць з поля зроку творчых маладых людзей і садзейнічаць далейшаму развіццю іх здольнасцей. На дадзены момант складзены і выдадзены першы мульты-медыйны дыск, на якім змяшчаюцца звесткі пра 244 бы-лых стыпендыятаў, якія ўжо скончылі навучальныя ўста-новы [9, 16, 22].

Фондам запланавана выданне кампакт-дыска "Таленты Беларусі-2005", мульцімедыйнае выданне з серыі "Славу-тыя настаўнікі, майстры мастацтваў – таленавітай мола-дзі".

24 мая 2005 г. кіраўнік дзяржавы А. Лукашэнка ўру-чыў пасведчанні і нагрудныя знакі навучэнцам – перамож-цам міжнародных алімпіяд, творчых конкурсаў, фестыва-ляў, – стыпендыятам спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэс-публікі Беларусь па падтрымцы адоранай і таленавітай мо-ладзі за 2004 г. Як падкрэсліў кіраўнік краіны, урад Бе-ларусі надае вялікае значэнне прафесійнаму стаўленню і духоўнаму развіццю моладзі. Менавіта таму ў рэспубліцы стала добрай традыцыяй дзяржаўная падтрымка адоранай моладзі – юных кампазітараў, выканаўцаў, акцёраў, рэжы-сёраў, танцораў, мастакоў, паэтаў – усіх тых, хто складае авангард творчай моладзі. За апошні час узровень дасяг-ненняў моладзі ў галіне культуры, мастацтва, навукі знач-на ўзрос, і гэта сведчыць аб эфектыўнасці палітыкі дзяр-жавы ў гэтай сферы [1, 9, 20].

28 чэрвеня 2005 г. адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэс-публікі Беларусь з прадстаўнікамі таленавітай моладзі. За-прашэнне прыняць удзел у сустрэчы атрымалі больш за 60 маладых людзей, якія сталі лаўрэатамі і стыпендыятамі спецыяльных прэзідэнцкіх фондаў у мінулыя гады. Кіраў-нік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі павінна быць вы-працавана комплексная і больш эфектыўная сістэма адбору і

падтрымкі таленавітых і адораных маладых людзей, у сувязі з чым вялікае значэнне мае далейшая работа з мэ-тавай праграмай “Маладыя таленты Беларусі] ”3].

У ліпені 2003 г. пры Цэнтральным камітэце Грамадска-га аб’яднання *“Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”* быў створаны *Рэспубліканскі Цэнтр творчай і навуковай моладзі* (РЦТіНМ). Мэта Цэнтра – аб’яднанне намаганняў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, творчых саюзаў і іншых устаноў ва ўдасканаленні працы з творчай і навуко-вай моладдзю Рэспублікі Беларусь. Цэнтр садзейнічае ства-рэнню матэрыяльнай, тэхнічнай, кансультатыўнай і інфар-мацыйнай базы па працы з творчай і навуковай моладдзю; ажыццяўленню падтрымкі таленавітай моладзі, якая жыве ў аддалёных раёнах рэспублікі, у рэалізацыі яе ініцыятыў; правядзенню сумеснай работы з зацікаўленымі арганіза-цыямі і ведамствамі па аказанні прафесійнай кансалцінга-вай дапамогі; наладжванню кантактаў з прадзюсерскімі, творчымі, навуковымі, камерцыйнымі, рэкламнымі цэнт-рамі і фірмамі ў Беларусі і за мяжой з мэтай пашырэння кола магчымасцей для рэалізацыі дасягненняў таленавітай моладзі.

У кожнай вобласці ствараюцца філіялы Цэнтра, якія стануць ажыццяўляць сваю дзейнасць у цесным супрацоў-ніцтве з аддзеламі культуры і адукацыі, з дзяржаўнымі, камерцыйнымі і грамадскімі структурамі, з усімі, каму неабыякавы сённяшні дзень і будучыня маладога пакален-ня, хто гатовы прыкласці намаганні, каб існуючы творчы патэнцыял беларускай моладзі атрымаў развіццё і быў за-патрабаваны ў грамадстве [12].

Таленавітая моладзь – гэта не толькі кадравы рэзерв ва ўсіх сферах, але і самая актыўная, самая адукаваная, са-мая разнабакова развітая частка нашага грамадства, здоль-ная ўжо сёння на высокім прафесійным узроўні рэалізоў-ваць сацыяльныя заказы, садзейнічаць развіццю культуры і мастацтва Беларусі і ўдасканаленню яе іміджу на міжна-родным узроўні. Аднак для гэтага патрэбна не толькі матэ-рыяльная, але і прадзюсерская падтрымка талентаў. Гэта – сістэма конкурсаў, прэзентацый, семінараў, фестываляў, якая дасць магчымасць кожнай творчай рабоце моладзі быць “пачутай” і “ўбачанай”, атрымаць прадзюсерскую ацэнку, а ў выпадзе сапраўднай удачы – і дапамогу. Усё гэта павінна ажыццяўляцца на прафесійнай аснове. Мена-віта таму РЦТіНМ наладзіў цеснае супрацоўніцтва з усімі творчымі саюзамі, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мас-тацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі і іншы-мі ўстановамі. Цэнтр разам са сродкамі масавай інфарма-цыі павінен забяспечваць інфармацыйную падтрымку

тале-навітай моладзі, даступнасць і адкрытасць звестак пра гранты, конкурсы, міжнародныя форумы мастацтваў, фес-тывалі і падрыхтоўку ў сувязі з гэтым мэтавай інфармацыі [12].

*Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў* спра-вядліва называюць “кузняй творчых кадраў”. З моманту першага набору 1945 г. яе выпускнікі пастаянна папаўнялі драматычныя тэатры, захоўваючы ў трупах баланс сталасці і маладосці. У пачатку 1990-х гг. наладжаная сістэма раз-меркавання дыпломнікаў дала збой. Большасць тэатраў не маглі забяспечыць акцёраў кватэрамі і нават інтэрнатамі. Тыя выпускнікі, што аказаліся незапатрабаванымі, выму-шаны былі змяніць прафесію або ўехаць за межы краіны. У сярэдзіне 1990-х гг. сітуацыя з творчай моладдзю дасяг-нула крытычнай адзнакі. Так, у Нацыянальным акадэміч-ным драматычным тэатры імя Я. Коласа ўзрост самай ма-ладой актрысы дасягнуў 35 гадоў. Не ў лепшым станові-шчы былі і іншыя драматычныя калектывы. Як вядома, моладзь – будучыня тэатра, такім чынам пад пагрозай апы-нулася будучыня ўсяго беларускага сцэнічнага мастацтва [4].
Выратавальная ідэя пераадолення крызіснай сітуацыі ўзнікла і была ўпершыню рэалізавана ў Гомельскім аблас-ным драматычным тэатры. Дырэктар В. Рагоўская, галоў-ны рэжысёр у той час Л. Манакова паспрабавалі вырашыць праблему ўласнымі сіламі. Яны правялі карпатлівую працу па выяўленні здольнай моладзі ў горадзе. Дзякуючы іх на-маганням пры тэатры была створана студыя, навучэнцы якой спалучалі тэарэтычныя заняткі пад кіраўніцтвам вя-дучых акцёраў, рэжысёраў і практычны ўдзел у спектак-лях бягучага рэпертуару. Найбольш адораныя студыйцы накіроўваліся на вучобу ў Мінск. Так у БДАМе з’явілася новая, завочная форма падрыхтоўкі акцёраў, а пазней і іншых спецыялістаў. Акрамя вырашэння пэўных сацыяль-ных праблем, гэта замацоўвала творчае ўзаемадзеянне тэат-раў з ВНУ. Да таго ж маладыя акцёры пазбаўляліся няпро-стага працэсу ўваходжання ў прафесійны калектыў, які падчас вучобы заставаўся для іх родным домам.
Дыпломныя паказы апошніх работ выявілі даволі тры-вожную тэндэнцыю, калі асобныя педагогі абмяжоўваліся канцэртным шоу, а замест паўнацэннага спектакля прапа-ноўвалі мантаж асобных сцэн, што пазбаўляла студэнтаў магчымасці паглыбіцца ў псіхалогію характараў і прыму-шала працаваць на канчатковы вынік. У гэтай сувязі трэба адзначыць працу загадчыка кафедры майстэрства акцёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Л. Манаковай, якая з 1973 г. працуе ў БДАМе

і па праву лічыцца адным з лепшых педагогаў у галіне падрыхтоўкі акцёраў. Вуча-ніца К. Саннікава і В. Рэдліх, Л. Манакава ў сваёй твор-часці спавядае прынцыпы рэалістычнага тэатра і на прак-тыцы рэалізуе запаветы сваіх настаўнікаў. Разам з тым яна разумее рэалізм не як догму, а як мастацкі кірунак, які знаходзіцца ў працэссе пастаяннага абнаўлення і раз-віцця. Таму спектаклі Л. Манаковай заўсёды вабяць да-кладнай канцэптуальнасцю і псіхалагічнай глыбінёй у спа-лучэнні з сучаснай вобразнай мовай і яркай тэатральнай формай. Рэжысёр тонка адчувае сінтэтычную прыроду ак-цёрскай творчасці і ў сваёй педагагічнай дзейнасці імкнец-ца да выхавання універсальнай асобы акцёра, які б даска-нала валодаў усімі сродкамі сцэнічнай выразнасці – май-стэрствам тэхнікі, словам, рухам, пантамімай, вакалам і г.д. Спектаклі, пастаўленыя Л. Манаковай і пад яе кіраў-ніцтвам, уражваюць глыбінёй думкі, ансамблевасцю і вы-конваюцца акцёрамі лёгка, нязмушана, на адным дыханні. Аднак за гэтай лёгкасцю – вялікая, самаадданая праца педагога, які не толькі раскрывае сваім вучням таямніцы прафесіі, але крок за крокам далучае іх да сусветнай куль-турнай спадчыны, да спасціжэння традыцый і эстэтычных заваёў сучаснага тэатральнага мастацтва [4].

Дыпломныя спектаклі студэнтаў БДАМ сведчаць, што ў тэатры краіны прыходзіць таленавітая моладзь. Педагогі па спецыяльных дысцыплінах шмат робяць для прафесій-най падрыхтоўкі студэнтаў, і выпускнікі годна дэманстру-юць сваю прафесіянальнасць падчас экзаменаў. Аднак дып-ломныя паказы выяўляюць і шэраг праблем, адны з като-рых існуюць шмат гадоў, другія – маюць прыкметы дня сённяшняга. Галоўныя з іх:

*Рэпертуар.* Толькі на першы погляд можа падацца, што афіша дыпломных спектакляў фарміруецца спантанна. На самой справе кіраўнік курса павінен вырашыць шэраг складаных задач. Па-першае, падабраць розныя па жанру творы, у якіх найбольш поўна раскрылася б індывідуаль-насць кожнага студэнта. Па-другое, абавязкова знайсці добрую беларускую п’есу, каб не парваўся ланцужок сувязі з нацыянальнай культурнай традыцыяй. Па-трэцяе, вызна-чыць групу рэжысёраў, пастаноўшчыкаў, пажадана адна-думцаў у светапоглядным плане, адметных па сваіх мас-тацкіх прыхільнасцях. Па-чацвёртае, прасачыць, каб дып-ломныя спектаклі не ператварыліся ў будзённы вучнёўскі паказ, а сталі святам як для саміх акцёраў, так і для гле-дача.

*Пракат спектакляў.* Паказ дыпломных спектакляў пачынаецца прыкладна за паўгода да экзаменаў. І сёння паўстае пытанне пра тое, што акадэмія, як і іншыя дзяр-жаўныя ўстановы, павінна актыўна ўваходзіць

у сістэму рынкавых адносін. Гэта значыць, неабходна вучыцца сама-стойна зарабляць грошы, якія пайшлі б на патрэбу таго ж студэнцкага тэатра. Вядома, знайсці зацікаўленых людзей, гатовых плаціць грошы за мастацтва, няпроста. Дапамагчы ў гэтым маглі б студэнты, якія вучацца па спецыяльнасці “арганізацыя і кіраванне тэатральнай справай”. Для іх такая праца стала б добрай прафесійнай практыкай.

*Жыццё. ВНУ. Тэатр*. Працэс навучання студэнтаў у БДАМе ніколі не абмяжоўваўся прафесійнай падрыхтоўкай і заўсёды ўключаў важны момант выхавання асобы. Сёння гэта праблема мае свае спецыфічныя адзнакі. На маладое пакаленне абрынуліся грамадскія катаклізмы, якія не маг-лі не паўплываць на свядомасць. Таму педагогам даводзіц-ца шмат увагі надаваць фарміраванню светапогляду сту-дэнтаў, іх далучэнню да сапраўдных культурных і духоў-ных каштоўнасцей. Аднак маладым акцёрам, выхаваным на гуманістычных ідэалах, часам даволі цяжка ўваходзіць у рэальнае жыццё. На сцэне многіх тэатраў ідуць творы, насычаныя брудам, ненарматыўнай лексікай, і таму часта адбываецца канфлікт паміж высокімі памкненнямі і про-зай жыцця. Аднак хочацца верыць, што энергія таленту і маладосці змогуць пераадолець цяжкасці, і таленавітыя, духоўна багатыя маладыя творцы знойдуць прымяненне сваім здольнасцям на тэатральных сцэнах краіны [4].

Відавочна, што ў сучасных складаных умовах дзяржава аказвае дзейсную падтрымку нацыянальнай культуры, у тым ліку творчай будучыні краіны. Аб гэтым сведчыць наведванне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лука-шэнкам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якое адбылося 15 мая 2003. Творчая сустрэча кіраўніка дзяржа-вы са студэнтамі і выкладчыкамі ўстановы доўжылася пяць гадзін. *“Дзяржава і творчая асоба”* – такі кантэкст быў закладзены кіраўніком краіны ў своеасаблівую лекцыю, якая фактычна з’явілася праграмным пасылам да маладых творцаў Беларусі. Прэзідэнт адзначыў, што культура і мас-тацтва з’яўляюцца састаўнай часткай дзяржаўнай ідэало-гіі, стратэгічным рэсурсам нашай краіны.

У сваім выступленні кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што і надалей будзе падтрымліваць моладзь у яе творчых пошуках і прапановах, аднак пры ўмове, што прапанава-ныя эксклюзіўныя творчыя праекты стануць фактам са-праўднага Мастацтва. Адным з актуальных пытанняў, за-кранутых на сустрэчы, было стварэнне сучаснай нарматыў-на-прававой базы ў галіне культуры. У час сустрэчы лідэр краіны паабяцаў разгледзець балючыя праблемы ўстановы, у прыватнасці, вырашыць

пытанне з дадатковымі плошча-мі для творчых майстэрань і інтэрната акадэміі. Кіраўнік дзяржавы падтрымаў напрамак развіцця нацыянальнай творчай школы, у аснове якога знаходзіцца рэалістычнае, гуманістычнае мастацтва. На гэтым падмурку базіравалася і будзе развівацца надалей мастацкае навучанне [8, 18, 23].
Дарэчы, у 2005 г. Беларуская дзяржаўная акадэмія мас-тацтваў адзначае сваё 60-годдзе. Сёлета сцены акадэміі пакінулі, каб пачаць асобнае творчае жыццё, 143 маладыя творцы. З іх 103 студэнты дзённай формы навучання і 40 завочнікаў.
Як адзначае рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Р. Смольскі, старэйшы факультэт, з якога пачыналася дзейнасць акадэміі, – тэатральны. Раз у 4 гады выпускаюцца артысты лялечнага тэатра. Выпускнікі гэтага года (курс А. Ляляўскага) запрошаны ў Германію на між-народны фестываль лялечных тэатраў. Неабходна адзна-чыць адметны ўзровень падрыхтоўкі студэнтаў. Гэта ўжо сапраўдныя прафесіяналы, за апошнія 2 гады яны ўдзель-нічалі ў многіх фестывалях і прывезлі шмат узнагарод. Ёсць у 2005 г. дыпломнікі па спецыяльнасці “рэжысура драмы” (курс А. Яфрэмава).
Нядаўна Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Лукашэнка на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй звярнуў увагу на не-абходнасць развіцця ў краіне тэлемастацтва, дзе аператар-ская праца іграе адну з найважнейшых роляў. 11 вы-пускнікоў па гэтай спецыяльнасці, якіх рыхтавала лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР А. Суханава, пакінулі сёлета сце-ны акадэміі.
Мастацкі факультэт закончылі ў 2005 г. 4 жывапісцы, 3 графіка, 3 скульптара і 5 мастакоў манументальна-дэка-ратыўнага мастацтва. Размеркаванне ў іх своеасаблівае – праца ў Беларускім саюзе мастакоў.
57 маладых спецыялістаў па 8 спецыяльнасцях пад-рыхтаваў у гэтым годзе факультэт дызайну і прыкладнога мастацтва.
Неабходна адзначыць і плённую вучобу студэнтаў за-вочнага аддзялення па спецыяльнасці “акцёрскае мастацт-ва драматычнага тэатра і кіно” (курс Л. Манаковай).
Усе выхаванцы акадэміі атрымалі размеркаванне, і тым не менш установа не змагла задаволіць усе заяўкі, а гэта азначае, што выпускнікі гэтых спецыяльнасцей ка-рыстаюцца попытам у творчых установах краіны і розных арганізацыях.  Трэба таксама ўлічваць, што большасць сту-дэнтаў акадэміі пачынаюць працаваць па спецыяльнасці яшчэ падчас навучання [25].
Конкурс у акадэміі стабільна высокі, летась ён склаў прыкладна 4,5 чалавекі на месца. Па асобных спецыяль-насцях, што карыстаюцца павышаным попытам (акцёрскае мастацтва, дызайн), лічба прахаднога

бала яшчэ больш вы-сокая.
У 2005 г. адбудзецца набор па спецыяльнасці “акцёр-скае мастацтва тэатра лялек”. Другі раз пройдзе набор на спецыяльнасць “акцёрскае мастацтва музычнага тэатра”. Па спецыяльнасці “рэжысура” будуць набірацца абітурыен-ты па двух кірунках: “рэжысура эстрады” і “рэжысура тэ-лебачання”. Ідзе набор па спецыяльнасці “тэлеаператар-ства”. У 2005 г. адкрываецца новая мастацтвазнаўчая спе-цыяльнасць – “кінатэлезнаўства”.
На мастацкім факультэце набор будзе ажыццяўляцца па класічнай схеме. Прапануюцца такія новыя спецыяль-насці, як “фотаграфіка”, “тэлерэклама“ ,”дызайн віртуаль-нага асяроддзя”.
На завочным аддзяленні студэнты змогуць атрымаць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях “майстэрства ак-цёра тэатра і кіно”, “рэжысура эстрады“ ,”рэжысура тэле-бачання“ ,”гукарэжысура”, “тэлеаператарства”.
Па ўсіх гэтых спецыяльнасцях прымаюцца студэнты як на бюджэтную форму навучання, так і на платнай асно-ве [25].
Пяць гадоў таму дырэктар Беларускага абласнога тэат-ра драмы і музыкі А. Козак выступіў з нестандартнай пра-пановай аб адкрыцці ў *Брэсцкім музычным каледжы* ад-дзялення *“тэатральнае мастацтва”*. У чэрвені 2005 г. другі выпуск гэтага аддзялення здаваў дыпломныя работы. Былі паказаны два разнапланавых спектаклі: “Федра”
М. Цвятаевай і “Білоксі” Н. Саймана. Пастаноўкі атрымалі высокую адзнаку, і кіраўніцтва тэатра абмяркоўвае пытан-не ўводу гэтых спектаклей у рэпертуарную афішу. Як міні-мум 4 выпускнікі войдуць у трупу тэатра.
Паэма М. Цвятаевай “Федра” аказалася вельмі нялёг-кай для пастаноўкі, у першую чаргу з-за складанай паэ-тычнай мовы, аднак пры ўсёй сваёй элітарнасці гэты ка-мерны спектакль, думаецца, знойдзе сваю аудыторыю. Доб-ра паказалі сябе маладыя акцёры і ў шырокім, маштабным спектаклі “Білоксі”.
Трэба адзначыць, што другі выпуск тэатральнага аддзя-лення атрымаўся моцным. У ім не толькі прысутнічаюць яркія артыстычныя асобы, ад якіх можна чакаць вялікай творчай будучыні, але відавочна, што яны добра адчуваюць адзін аднаго, і на сцэне бачыцца зладжаны акцёрскі ан-самбль.
Брэсцкі тэатр драмы і музыкі, магчыма, адзіны ў краі-не, дзе ўдалося ў пэўнай меры вырашыць праблему пад-рыхтоўкі маладых артыстаў (ва ўсякім выпадку, сярод правінцыйных тэатраў). Гэта запатрабавала значных нама-ганняў, у першую чаргу таму, што цяжка было вырашыць

пытанне аб аплаце працы выкладчыкаў. Два выпускі знач-на амаладзілі трупу тэатра, аднак гэтага недастаткова. Но-вых набораў на тэатральнае аддзяленне няма ўжо 5 гадоў. Для музычнага каледжа гэта справа клапатлівая, а адкры-ваць новы факультэт ва універсітэце – таксама няпроста і доўга. Але ж  гэта пытанне пажадана вырашыць пазітыўна і ў кароткі тэрмін [19].

Гісторыя музычнай культуры і мастацтва Беларусі XX ст. у значнай ступені залежыла ад гісторыі *Беларускай дзяр-жаўнай акадэміі музыкі*, якая ў 2002 г. адзначала сваё
70-годдзе. У гэтай музычнай ВНУ пачалі сваё творчае жыццё шматлікія вядомыя мастацкія калектывы рэспублі-кі: ДАВТ оперы і балета, Дзяржаўны акадэмічны аркестр імя І. Жыновіча, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, Дзяржаўны камерны аркестр, Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі і інш.
На сённяшні дзень вялікай папулярнасцю ў Беларусі і за яе межамі карыстаюцца сімфанічны аркестр “Маладая Беларусь”, духавы аркестр “Фанфары Беларусі”, канцэрт-ны хор Акадэміі музыкі і іншыя калектывы. Выканальніц-кая школа БДАМ атрымала шырокае міжнароднае пры-знанне: толькі ў 2000–2002 гг. лаўрэатамі і дыпламантамі прэстыжных міжнародных конкурсаў сталі амаль 50 сту-дэнтаў БДАМ.
Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі з’яўляецца нацыянальным навуковым цэнтрам беларускага музыка-знаўства, этнамузыкалогіі і фальклАрыстыкі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва, музычнай педагогікі. Толькі за 1998–2002 гг. выкладчыкамі акадэміі было апуб-лікавана навуковых, метадычных, нотных і іншых выдан-няў каля 1000 друкаваных аркушаў. 56 выкладчыкаў ма-юць ганаровыя званні народных артыстаў СССР і Беларусі, заслужаных артыстаў і заслужаных дзеячаў мастацтва Бе-ларусі, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі Беларусі. 70% вы-кладчыкаў маюць вучоныя ступені [14].
Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі рыхтуе не толькі выканаўцаў на інструментах класічных напрамкаў. Існуюць кафедры гісторыі музыкі, тэорыі музыкі, беларус-кай музыкі, магістратура, аспірантура, савет па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Усё гэта дае магчы-масць выпускнікам, якія маюць цікавасць да ведаў, пра-цягваць навучанне, абараняць дысертацыі. На сённяшні дзень акадэмія мае вялікі навуковы патэнцыял. Тут працу-юць 7 дактароў, 37 кандыдатаў навук, 60 дацэнтаў, 35 пра-фесараў. За перыяд з 1998 па 2002 гг. больш за 100 студэн-таў акадэміі сталі лаўрэатамі міжнародных конкурсаў. Кож-ны год у

аспірантуру прымаецца 15 чалавек, і гэта – буду-чыня Акадэміі музыкі. Навукоўцы акадэміі распрацоўваюць тэмы, звязаныя з гісторыяй беларускай музыкі за ўвесь час існавання Бела-русі (ад XIII ст. і да нашых дзён). Аднак нельга замыкацца на коле нацыянальнага, лічыць рэктар Беларускай дзяр-жаўнай акадэміі музыкі, народны артыст Беларусі М. Казі-нец. Студэнт павінен вывучаць сваё, але ж і ведаць куль-туру ўсяго чалавецтва, а таксама месца, якое займае Бела-русь у агульнай культуры [14].
Важным фактарам развіцця Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прызнання яе ў якасці навуковага і аду-кацыйнага цэнтра міжнароднага ўзроўню з’яўляецца яе супрацоўніцтва з навучальнымі і навуковымі ўстановамі Расіі, Украіны, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, ЗША, КНР, Турцыі і інш. У акадэміі навучаюцца больш за 100 замеж-ных грамадзян – магістраў і аспірантаў. Беларуская дзяр-жаўная акадэмія музыкі з’яўляецца членам шэрага міжна-родных музычных арганізацый па музычнай адукацыі.
23 мая 2002 г. БДАМ наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Вынікам наведвання стаў прата-кол даручэнняў, якім прадугледжана выкананне шэрагу мерапрыемстваў па падтрымцы і развіцці Акадэміі музыкі, у прыватнасці, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальнай установы, далейшая падрыхтоўка высокаква-ліфікаваных кадраў, у тым ліку для рэгіёнаў рэспублікі, стварэнне маладзёжнага опернага тэатра, адкрыццё новай спецыялізацыі “рэжысура музычнага тэатра” і інш. [14, 15].
У Беларусі патрэбны прафесіяналы такога кшталту, як харэограф-пастаноўшчык, харэограф-рэпетытар. Раней іх рыхтавалі ў Санкт-Пецярбургу, сёння павінны рыхтаваць у сваёй краіне. Для гэтага некалькі гадоў таму адкрылі ў ака-дэміі кафедру харэаграфіі, на якой працуе мастацкі кіраў-нік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета В. Елізар’еў.
З новага вучэбнага года (2005/2006) у БДАМ пачына-ецца перападрыхтоўка па спецыяльнасці “прадзюсарства ў сферы мастацтва”. Ідэя стварэння падобнага праекта абу-моўлена часам. У нас многа таленавітых маладых музы-кантаў, якім патрабуецца падтрымка, “раскрутка”, як сён-ня гавораць. У Беларусі ўжо ёсць некаторая колькасць людзей, якія займаюцца арганізацыяй канцэртнай дзейнас-ці, але працуюць яны ў асноўным з эстраднымі выканаў-цамі.
Новы курс разлічаны на спецыялістаў, якія маюць вы-шэйшую адукацыю, на студэнтаў БДАМ, а таксама на тых, хто мае як мінімум пачатковую музычную адукацыю. Ву-чэбны план уключае 1.000 гадзін. У

ім ёсць як дысцыплі-ны гуманітарнага, так сацыяльна-эканамічнага плана, агульныя і спецыяльныя. Пасля атрымання дыплома яго ўладальнік, спалучаючы атрыманыя веды і навыкі, зможа стаць кваліфікаваным прадзюсарам-практыкам з адпавед-най тэарэтычнай падрыхтоўкай. Сапраўдны прадзюсар вы-лучаецца тым, што стварае творчую ідэю, пасля чаго пачы-нае шукаць грошы, людзей, якія працуюць над яе ўвасаб-леннем. Пры гэтым павінен думаць над тым, як яго ідэя будзе запатрабавана, для чаго неабходна ведаць эканаміч-ныя катэгорыі. Прафесійны прадзюсар павінен мець твор-чы густ, разбірацца ў нюансах творчага працэсу, умець падбіраць людзей для ажыццяўлення свайго праекта, ары-ентавацца ў патрэбах рынку [24].
Гаворачы аб становішчы з размеркаваннем сёлетніх вы-пускнікоў, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі М. Казінец прыводзіць наступныя лічбы: на 160 выпускні-коў было атрымана 228 заявак. Да прыкладу, з 8 музыка-знаўцаў размеркаваны 6, 2 атрымалі свабодны дыплом па сямейных абставінах; заявак жа было 14. З кампазітарамі сітуацыя супрацьлеглая: на 4 выпускнікоў была толькі 1 заяўка, але ў выніку размеркаваны былі ўсе. Па іншых спецыяльнасцях карціна такая: на 23 харавіка – 29 заявак, на 32 піяніста – 56, на 2 гітарыста – 9, на 14 баяністаў – 24, на 12 скрыпачоў – 18, на 3 флейтыста – 6, на 2 клар-нетыста – 6, на 2 ударніка – 4, на 1 трамбаніста – 3, на 5 трубачоў – 9, на 2 дырыжора – 3 заяўкі. Выключэнне склалі вакалісты, дамрысты, віяланчэлісты і адзіны тубіст. На іх заявак ці не было зусім, ці было разы ў 2 меней. Усяго са 160 выпускнікоў не размеркаваны аказаліся 29: хтосьці атрымаў вольны дыплом па сямейных абставінах, хтосьці – як грамадзянін іншай краіны, хтосьці – з-за платнага навучання. Толькі 9 чалавек не атрымалі размер-кавання з-за адсутнасці месца працы. Прычыны вялікай запатрабаванасці выпускнікоў ака-дэміі музыкі ў тым, што апошнім часам і дзіцячыя музыч-ныя школы, і нават самадзейныя калектывы – усе аддаюць перавагу спецыялістам з вышэйшай адукацыяй. Зараз на-родныя ансамблі карыстаюцца вялікім поспехам, вядуць багатае канцэртнае жыццё, атрымліваюць замежныя запра-шэнні – і, вядома, зацікаўленыя ў тым, каб у іх на паста-яннай аснове працавалі высокапрафесійныя калектывы. Зацікаўлены ўстановы культуры і ў тым, каб да іх прыхо-дзіў музыкант шырокай спецыялізацыі, які не толькі б валодаў сваім інструментам, але і мог бы прадырыжыра-ваць, узначаліць выканальніцкі калектыў [13].

*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мас-тацтваў* паспяхова прайшоў у 2002 г. атэстацыю, пацвер-дзіўшы высокі статус вядучай

навучальнай установы ў на-цыянальнай сістэме адукацыі. Па выніках атэстацыі адзна-чана, што БДУКіМ развіваецца вельмі дынамічна, трывала ўвайшоўшы ў сістэму вышэйшай адукацыі нашай краіны, забяспечвае галіну высокакваліфікаванымі кадрамі.
У сваёй дзейнасці ўстанова ажыццяўляе работу па вы-кананні пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Бе-ларусь па выніках наведвання гэтай вышэйшай установы ў 2000 г. Універсітэту перададзены будынак на вул. Маскоў-скай, 18-а. У ім праведзены капітальны рамонт і арганіза-ваны навучальны працэс (у будынку працуюць чатыры кафедры універсітэта). Ідзе актыўнае асваенне новай залы Маладзёжнага тэатра эстрады, які быў перададзены універ-сітэту. Больш за 25 гадоў БДУКіМ рыхтаваў спецыялістаў культуры, не маючы ніякай канцэртнай залы, таму ўсе кіраўнікі творчых калектываў універсітэта пачалі актыўна асвойваць канцэртна-сцэнічную пляцоўку, пра якую даўно марылі. Але, як паказала практыка, не ўсе калектывы ўстановы аказаліся гатовымі да сучасных камерцыйных законаў шоу-індустрыі. А яны жорсткія: мастацтва павінна быць не толькі якасным, змястоўным і цікавым. “Канвер-саванасць” і запатрабаванасць шырокай публікай – не менш важныя элементы сучаснага мастацтва. Таму некато-рыя калектывы сутыкнуліся з шэрагам праблем, такіх як рэжысура і гукарэжысура канцэрта, маркетынг (рэклама і продаж білетаў).
Выступленні мастацкіх калектываў установы паказва-юць маштабнасць, разнастайнасць і шматгранную накіра-ванасць дзейнасці універсітэта, а таксама пэўны прафесій-ны рост студэнтаў асобных спецыялізацый і калектываў [26].
Сярод лепшых выканаўцаў – калектывы кафедры ха-рэаграфіі БДУКіМ, якая нядаўна адзначыла сваё 25-годдзе. Выступленні маладых творцаў абуджаюць шэраг пытан-няў, што патрабуюць абагульненняў, сярод каторых: чаму б канцэрты такіх выдатных навучальных калектываў не праводзіць, напрыклад, на сцэне Палаца Рэспублікі, каб іх змог наведаць самы розны глядач, каб рэклама прайшла ва ўсіх рэспубліканскіх СМІ? Сваімі дасягненнямі трэба гана-рыцца!
Наступная думка: чаму кафедра харэаграфіі БДУКіМ, калектыў яе выкладчыкаў і студэнтаў не можа зрабіцца той асновай, грунтам, на якім праз нейкі час будзе стварац-ца Тэатр сучаснага танца, які можа аб’яднаць і эстрадны, і народны, і сучасна-аўтарскі кірункі? Такі тэатр, своеасаб-лівая лабараторыя, палігон для эксперыментаў тых харэо-графаў, якія шмат працуюць, шмат шукаюць, але толькі зрэдку, падчас фестываляў і конкурсаў могуць паказаць шырокаму гледачу сваю работу, вельмі неабходны і гораду Мінску, і ўсёй краіне. Пэўныя захады ў

гэтым напрамку ёсць.
Яшчэ адна думка: у г. Мінску, сталіцы рэспублікі, няма свайго ўласнага міжнароднага харэаграфічнага фес-тывалю. У Віцебску праводзіцца Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, якому ўжо больш за 15 гадоў і які збі-рае з усяго свету аматараў менавіта мадэрнавай харэагра-фіі. У Гомелі ладзіцца “Сожскі карагод” – фестываль, на які прыязджаюць калектывы пераважна народнага накі-рунку.
Некалькі гадоў таму ў Мінску існаваў Міжнародны фестываль “Я люблю балет”, арганізатарамі якога выступа-лі Беларускі харэаграфічны каледж і Нацыянальны акадэ-мічны тэатр балета. Сёння наўрад ці варта рабіць будучы форум балетным. У праграме фестывалю можна паяднаць і народны танец, і эстрадны, і новыя работы беларускіх харэографаў, вытрыманыя ў самых розных стылях. У Беларусі існуе шмат танцавальных калектываў, якімі кіруюць сапраўдныя прафесіяналы, майстры свайго дзела. Калектывы – як дзіцячыя, так і дарослыя – з радасцю паказалі б свае новыя праграмы сталічнаму гледачу (гэта было б дастатковым стымулам для далейшага развіцця), і глядач убачыў бы шмат цікавага, вартага захаплення. Прэстыжных пляцовак – канцэртных, тэатральных – у Мінску хапае [21].
Некалькі гадоў таму ў Беларускім дзяржаўным універ-сітэце культуры і мастацтваў былі створаны і паспяхова працуюць навукова-творчыя лабараторыі. Ажыццяўляецца работа па абагульненні літаратурных, экспедыцыйных, этнаграфічных матэрыялаў па такіх відах народнага мас-тацтва, як ткацтва, саломапляценне, ганчарства і кераміка ў навукова-творчай лабараторыі “Традыцыйныя рамёствы беларусаў”, створана база даследаванняў у лабараторыі “Беларускія народныя музычныя інструменты] ”15].
Рэктар БДУКіМ Я. Грыгаровіч адзначае, што універсі-тэт нязменна трапляе ў пяцёрку найпрэстыжных ВНУ краіны. Колькасць заявак на сёння значна большая за лік выпускнікоў, што маюць адпаведную спецыяльнасць. На-прыклад, па спецыяльнасці “кіраўнік харэаграфічнага ка-лектыву” універсітэт здолеў забяспечыць заяўкі ад дзяр-жаўных арганізацый толькі на 50%“ ,бібліятэчны і інфар-мацыйны работнік” – на 40%“ ,харавая народная твор-часць” – на 35%.
Спектр прафесій, якія можна атрымаць у БДУКіМ, вельмі шырокі. Асабліва вялікі конкурс на спецыяльнасць “менеджэр сацыякультурнай сферы” – з улікам ільготні-каў, на адно месца там прэтэндуе да дваццаці кандыдатаў. Дастаткова вялікі конкурс існуе на спецыяльнасці, звяза-ныя з народнай ці этнаграфічнай творчасцю, што сведчыць аб цікавасці моладзі да нацыянальнай культуры [6].

Шматгадовы вопыт паказвае, што ў творчыя ВНУ прыходзяць вучыцца свядома, выпадковых людзей тут амаль не бывае. Шмат хто марыў пра сваю будучую прафе-сію з дзяцінства. Ад таго, якая моладзь прыйдзе вучыцца ў ВНУ, залежыць далейшы лёс беларускага прафесійнага мастацтва. Таму на выкладчыкаў ВНУ кладзецца вялікая адказнасць, каб у тым ці іншым юнаку ці дзяўчыне раз-гледзець талент, характар будучага творцы, руплівца на ніве нацыянальнага мастацтва [25].

*Мазура В.Я., галоўны бібліёграф АНІКМ*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Літаратура

1. ***Авдеева Н.*** “Культура – основа духовного богатства и общности нации” // Магілёўскі веснік. 2004. 9 кастр.
2. ***Авдеева Н.*** “Мы помогаем всем талантам Беларуси…” / беседовала О. Белявская // Народная газета. 2005. 18 мая.
3. ***Вялікі*** стымул і падтрымка // Культура. 2005. 2–8 ліп. (№ 27). С. 3.
4. ***Гаробчанка Т.*** Энергія таленту і маладосці // Мастацтва. 2003. № 9. С. 33–35; № 10–11. С. 33–34.
5. ***Гедройц В.К.*** Аб эстэтычнай адукацыі навучэнскай моладзі // Беларуская культура сёння: Гадавы агляд (2002). Мн., 2003. С. 65–70.
6. ***Грыгаровіч Я.*** “Фірмовая” школа, якую ні з чым не зблы-таеш / гутарыў І. Свірын // Культура. 2005. 4–10 чэрв. (№ 23). С. 4–5.
7. ***Дергач И.*** Таланты и кариатиды // Народная газета. 2005. 23 чэрв.
8. ***Жучко Н.*** Вы молоды, талантливы? Дерзайте! // Рэспуб-ліка. 2003. 16 мая.
9. ***Захарава В.*** Знайсці і падтрымаць // Звязда. 2005. 17 чэрв. С. 3.
10. ***Зива В.Ф.*** Трансформация системы художественных учеб-ных заведений в контексте модернизации образования // Вестник Московского государственного университета культуры и ис-кусств. 2005. № 1. С. 67–76.
11. ***Зорилова Л.С., Калугина Н.А.*** Особенности формирования индивидуального стиля личности специалиста культуры в усло-виях профессиональной подготовки // Вестник Московского госу-дарственного университета культуры и искусств. 2005. № 1. С. 77–81.
12. ***Іназемцава А.*** Маладыя таленты атрымаюць рэальную падтрымку // Мастацтва. 2003. № 9. С. 4–5.
13. ***Казінец М.*** Нашэсце высокага мастацтва / гутарыла Н. Бунцэвіч // Культура. 2005. 4–10 чэрв. (№ 23). С. 4.
14. ***Казінец М.*** Свята года: Акадэміі музыкі – 70! / гутарыла Н. Кардаш // Мастацтва. 2003. № 1. С. 30–33.
15. ***Казловіч М.І., Сцепанцоў А.І.*** Мастацкая адукацыя і на-вука // Беларуская культура сёння: Гадавы агляд (2002). Мн., 2003. С. 70–82.

16. ***Ксяневіч А.*** Таленты павінны быць запатрабаваныя // Раніца. 2005. 2 чэрв. С. 3.
17. ***Кудрина Е.Л., Устин Е.В.*** Формирование учебно-методи-ческого обеспечения по новому поколению государственных обра-зовательных стандартов высшего профессионального образования в области культуры и искусств // Вестник Московского государ-ственного университета культуры и искусств. 2005. № 1. С. 86–92.
18. ***Лукашэнка А.*** “Дзяржава з’яўляецца гарантам развіцця культуры і мастацтва” / запісаў С. Протас // Звязда. 2003. 16 мая. С. 1.
19. ***Микрюков А.*** Второй или последний выпуск театрального отделения? // Брестский курьер. 2005. (№ 27). Июнь. С. 23.
20. ***Молодые*** таланты радуют успехами // Белорусская нива. 2005. 25 мая. С. 1, 3.
21. ***Мушынская Т.*** Вечны рух: Кафедры харэаграфіі Беларус-кага універсітэта культуры – 25 гадоў // Мастацтва. 2003. № 10–11. С. 46–47.
22. ***Падтрымаць*** таленавітых // Культура. 2005. 18–24 чэрв. (№ 25). С. 4.
23. ***Прыярытэт*** запатрабаванага таленту // Культура. 2003. 17–23 мая. (№ 20). С. 2.
24. ***Скуратова Э.*** Торговцы в храме – это нормально / бесе-довала Л. Приходько // Минский курьер. 2005. 14 июля. С. 6. (Новое образование).
25. ***Смольскі Р.*** Новая хваля творцаў / гутарыў Р. Альшэўскі // Культура. 2005. 4–10 чэрв. (№ 23). С. 5.
26. ***Таірава Л.*** Музычны калейдаскоп // Мастацтва. 2003. № 2. С. 46–48.